**А. Р. Яшчанка**

# СУЧАСНАЯ МУЗЕЙНАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ ГІСТОРЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ (ДА 95-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЯ ЎСТАНОВЫ)

Апошнім часам вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі актывізавалі сваю дзейнасць у напрамку захавання гісторыі сваіх навукова-педагагічных калектываў. Праца ў гэтым накірунку праводзілася і раней, на працягу мінулых дзесяцігоддзяў былі створаны і функцыянавалі музеі ў шэрагу ўніверсітэтаў і інстытутаў. Іх наведвальнікамі з'яўляліся студэнты, выпускнікі, госці ўстаноў. Высокія патрабаванні сённяшняга дня, а таксама наяўныя новыя тэхналагічныя магчымасці, неабходнасць азнаямлення з матэрыяламі такога кшталту больш шырокага кола жыхароў краіны і замежжа зрабілі актуальнай задачу па дапаўненню атрыманых раней матэрыялаў, сістэматызацыі дадзеных, стварэння электронных каталогаў, перагляду сродкаў прадстаўлення матэрыялаў, пашырэння праблемнага поля, паколькі сучасныя ўніверсітэты значна павысілі свой патэнцыял і пашырылі спектр кантактаў у самых розных сферах дзейнасці. З гэтай прычыны зварот да абмеркавання насычэння і форм працы сучасных музеяў, якія адлюстроўваюць гісторыю вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, надзвычай аргументаваны.

У 2025 г. установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны" адзначыла 95 год з дня стварэння. Гэты рубеж з'явіўся падмуркам для разгляду дасягненняў у падрыхтоўцы спецыялістаў і навуковых даследаваннях, рэалізацыі грамадскіх задач. Кіраўніцтва ўніверсітэта прыняла абгрунтаванае рашэнне аб абнаўленні экспазіцыі, якая адлюстроўвае старонкі ўніверсітэцкага жыцця.

Змест папярэдній экспазіцыі шмат у чым абапіраўся на звесткі, апублікаваныя ў першым выданні кнігі "Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины: исторический очерк" (2005 г.) [1], пазней друкаваліся яе дапоўненыя і дапрацаваныя варыянты, апошні з іх убачыў свет ў 2025 г. Стваральнікамі першага паказу гісторыі ўніверсітэта ў музейным фармаце былі К. Усовіч, А. Зелянкова і іншыя, вялікую ролю ў прэзентацыі працы выкладчыкаў і жыцця студэнтаў адыралі фотаздымкі фатографа газеты "Гомельскі ўніверсітэт" У. Чысціка, які зафіксаваў кожную значную падзею на працягу канца XX – пачатку XXI стагоддзя. Аднак падача матэрыяла, з цягам часу з'яўленных новых аспектаў для асвятлення прывялі да высновы аб неабходнасці перагляду як напаўнення экспазіцыі музейнымі прадметамі, так і метадаў іх дэманстрацыі.

Істотны ўнёсак у працу на працягу 2024 – 2025 гг. унеслі студэнты факультэта гісторыі і міжкультурных камунікацый – члены студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі "Лабараторыя па даследаванню гісторыі ўніверсітэта". У працэсе перапрацоўкі экспазіцыі выкарыстоўваліся прадметы і здабыткі, атрыманыя, у тым ліку, студэнтамі ранейшых выпускаў з першым кіраўніком гэтай СНДЛ дацэнтам Алай Іванаўнай Зелянковай.

У 2024 г. створаная раней музейная экспазіцыя была вынесена з адасобленага памяшкання ў адкрытую прастору вучэбнага корпуса № 4 (вуліца Савецкая, 104), дзе яна даступная для агляду ўсіх, хто выкладае, вучыцца або прыходзіць па справах ва ўніверсітэт.

У новым стане яна падзелена на дзве часткі, кожная з якіх адпавядае двум этапам станаўлення і развіцця гэтай вышэйшай навучальнай установы.

На 1 паверсе размешчаны вітрыны, у якіх распавядаеецца аб існаванні педагагічнага інстытута з 1930 г., прысваенні яму імя В. Чкалава, трагічных гадах ваеннага ліхалецця і ўдзеле ў абароне Айчыны выкладчыкаў і студэнтаў, пасляваенных гадах вучобы, стварэнні навуковых школ, удзеле навучэнцаў і выкладчыкаў у грамадскім жыцці БССР і, у цэлым, савецкай краіны. Лагічным працягам стала папулярызацыя падзей 1969 г., калі педагагічны інстытут атрымаў статус ўніверсітэта, усебаковы паказ старонак яго развіцця. Значны акцэнт пры перапрацоўцы экспазіцыі быў зорлблены на факт прысваення ўніверсітэту імя Францыска Скарыны.

На другім паверсе, таксама ў адкрытым доступе, знаходзіцца частка экспазіцыі, якая дэманструе сучасны этап дзейнасці ўніверсітэта ў XXI стагоддзі. Адукацыйны працэс, навуковыя дасягненні, выхаваўчая работа, праца па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі знайшлі адбітак пры фарміраванні новага экспазіцыйнага раду.

Сярод падыходаў, якія былі закладзены і апрабіраваны ў мінулай экспазіцыі, засталіся наступныя: зварот увагі на ўклад кіраўніцтва (дырэктараў і рэктараў), уключэнне матэрыялаў, прысвечаных першым крокам работы педінстытута ў 1930-ыя гг. і Вялікай Айчыннай вайне, вялікі пласт фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць студэнцкае жыццё, спорт, некаторыя матэрыялы аб Ф. Скарыне. У асобных частках магчыма разгледзець рэчыўныя матэрыялы, узнагароды і інш., якое было беражліва перанесена ў новы варыянт экспазіцыі.

Разам з тым з’явіліся новыя матэрыялы, былі падкрэслены асобныя старонкі гісторыі ўніверсітэта, прымяняліся сучасныя падыходы да кампаноўкі дакументаў, фотаздымкаў, рэчаў. На другім паверсе цэнтральная частка была адведзена інфармаванню аб месцы Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны ў грамадскім жыцці краіны і свету, узнагародах асобных кіраўнікоў і выкладчыкаў Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. У экспазіцыі з’явіўся новы аспепкт працы выкладчыкаў і студэнтаў – ваенна-патрыятычнае выхаванне. Асобны раздзел прадстаўляе сучасную навуку ў тварах – дзейнасць член-карэспандэнтаў НАН Беларусі, якія працуюць на розных факультэтах. Размешчаны матэрыялы, якія падцвярджаюць плённыя кантакты ўніверсітэта з Гомельскай Епархіяй Беларускай Праваслаўнай Царквы, выданні літаратуры па гэтай тэматыцы [2]. Набыла актуальнасць асвятленне працы валанцёраў у галіне дапамогі хворым дзецям, у сферы экалогіі (аховы леса на Гомельшчыне), правядзенні забаўляльных мерапрыемстваў у Гомелі (Дзень горада і інш.). Новыя фотаздымкі акрэсліваюць спартыўныя дасягненні, у тым ліку высокія паказчыкі ўніверсітэта ў алімпійскім руху.

Новае гучанне набыла тэма студэнцкіх атрадаў. Па-новаму прадстаўлена тэма першадрукара Ф. Скарыны на 1 паверсе. Задача рашаецца праз выстаўленне артэфактаў драматургічнага ўвасаблення біяграфіі і дзейнасці Ф. Скарыны, надання яго імя новым навуковым адзінкам, якія сталі навуковымі адкрыццямі дзякуючы намаганням даследчыкаў ўніверсітэта. Дзеля мастацкага аздаблення і лепшай перадачы гістарычных эпох у музейную экспазіцыю ўведзены рэпрадукцыі некаторых жывапісных палоцен выдатных беларускіх мастакоў, якія прысвяцілі свае творы студэнцкай тэме (“Вузаўцы” В. Волкава, “Завочніца” В. Савіцкага”). З мэтай аховы ад разбурэння арыгіналаў фотаматэрыялаў, газет і некаторых іншых дакументальных адзінак былі спецыяльна выкананы іх фотакопіі для размяшчэння ў вітрынах.

Музейная экспазіцыя запатрабавана для выхаваўчай працы сярод студэнцкай моладзі, яна з’яўляецца эфектыўным сродкам прыцягнення абітурыентаў, увасабляе павагу сучаснікаў да працоўнай дзейнасці папярэдніх пакаленняў выкладчыкаў і выпускнікоў, мае вялікі патэнцыял для пашырэння і ўдасканалення.

**Список использованных источников и литературы**

1. Старовойтов, М. И. Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины: исторический очерк / М. И. Старовойтов, А. И. Зеленкова, М. П. Савинская. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2005. – 359 с.

2. Ященко, О. Г. Гомель православный во второй половине XIX – начале XX века. Исторический очерк / О. Г. Ященко. – Мн. : Четыре четверти, 2018. – 60 с.